Экземпляр

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
А.В. Макоўчык
_______2022 г.
Рэгістрацыйны № УД-___/уч.
УД 26-1-№ Э18-2022/уч.

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ
# (ДРУГАЯ ПАЛОВА XVI СТ. – КАНЕЦ XVIII СТ.)

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей:
1–02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны
1–02 01 02 Гісторыя і сусветная мастацкая культура
1–02 01 03 Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа

2022 г.

Вучэбная праграма складзена на падставе тыпавой вучэбнай праграмы па абавязковым модулі для ўстаноў вышэйшай адукацыі, зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь (рэгістрацыйны № ТД-________/тып. ад ____._____.2022 г.).

**СКЛАДАЛЬНІК:**
А.Ф. Рацько, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
А.А.Цобкала, дацэнт кафедры міжкультурных камунікацый і рэкламы БДУКМ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Д. У.Дубінін, дацэнт кафедры кафедры ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**УЗГОДНЕНА:**
Дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі
"Гімназія № 147 г.Мінска" М.Ф.Вайценкова

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай гісторыі Беларусі і славянскіх народаў
(пратакол № 9 ад 30.03.2022).
Загадчык кафедры С.А.Талмачова

Навукова-метадычным саветам установы вышэйшай адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» (пратакол № 6 ад 19 . 04 . 2022).

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальных яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае.

Метадыст
вучэбна-метадычнага аддзела БДПУ Г.В.Вінаградава

Дырэктар бібліятэкі Н.П.Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Шматвекавая гісторыя Беларусі ўяўляе важную складовую частку гісторыі славянскай, еўрапейскай і сусветнай цывілізацый і займае важнае месца ў сістэме гуманітарнай падрыхтоўкі студэнцкай моладзі нашай краіны. Сваёй непаўторнай, гераічнай і трагічнай гісторыяй беларускі народ можа ганарыцца. Менавіта на гістарычных ведах фарміруецца нацыянальная свядомасць. Без ведання ўласнай гісторыі немагчыма забяспечыць росквіт краіны і прагназаваць яе развіццё.

У адпаведнасці з вучэбным планам вучэбная дысцыпліна «Гісторыя Беларусі (другая палова XVI ст. – канец XVIII ст.)» вывучаецца ў цеснай узаемасувязі з дысцыплінамі «Гісторыя Беларусі (другая палова XIII – першая палова XVI стст.)», «Гісторыя канфесій Беларусі», «Гісторыя Расіі і Украіны (XVII – першая палова XIX ст.)», «Краязнаўства Беларусі», «Этналогія Беларусі», «Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны», а таксама з дысцыплінамі па ўсеагульнай гісторыі. Гэта дае магчымасць акцэнтаваць увагу студэнтаў на міждысцыплінарных сувязях, выявіць ролю і месца нашага народа ў шырокім прасторавым і часавым дыяпазоне.

**Мэтай** вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя Беларусі (другая палова XVI ст. – канец XVIII ст.)» з'яўляецца фарміраванне ў студэнтаў фундаментальных ведаў па гісторыі Беларусі другой паловы XVI ст. – канца XVIII ст., і выхаванне на гэтай аснове пачуцця прыналежнасці да лёсу краіны і яе гісторыі.

Для рэалізацыі вызначанай мэты прадугледжваецца вырашэнне наступных **задач**:

– высветліць прычынна-выніковыя сувязі і заканамернасці гістарычнага развіцця беларускага народа ў кантэксце еўрапейскай і сусветнай гісторыі;

– садзейнічаць усведамленню студэнтамі сістэмы матэрыяльных, культурных і духоўных каштоўнасцей беларускага народа, якія служаць падмуркам для аналізу сучаснасці і вызначэння перспектыў будучай жыццядзейнасці;

– забяспечыць атрыманне тэарэтычных і практычных ведаў, якія дазволяць студэнтам правільна аналізаваць падзеі і факты гісторыі, рабіць неабходныя высновы і абагульненні;

– спрыяць фарміраванню падрыхтаванасці выпускніка вышэйшай школы як грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;

– стварыць неабходныя ўмовы для фарміравання ў студэнтаў пачуццяў прыналежнасці да гісторыка-культурнай спадчыны беларускага народа і адказнасці за яе захаванне;

– садзейнічаць ўсведамленню студэнтамі неабходнасці захавання дзяржаўнага суверэнітэту і выхавання ў іх патрыятызму;

– з дапамогай вывучэння зместу вучэбнай дысцыпліны спрыяць фарміраванню ў студэнтаў навуковага светапогляду.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен **ведаць:**

– асноўныя падзеі і факты ў гісторыі Беларусі;

– асаблівасці эканамічнага, сацыяльнага, палітычнага і культурнага развіцця Беларусі ў канкрэтна-гістарычны перыяд;

– этапы фарміравання беларускай народнасці і нацыі, станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен **умець:**

– выкарыстоўваць метадалогію гістарычнай навукі для аналізу гістарычнага развіцця беларускага народа;

– выяўляць асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця беларускай нацыі ў канкрэтна-гістарычныя перыяды;

– выкарыстоўваць гістарычны вопыт для аналізу і ацэнкі сучасных праблем у развіцці Беларусі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен **валодаць:**

– спосабамі адбору і сістэматызацыі гістарычнай інфармацыі;

– метадамі, формамі і сродкамі аптымізацыі, рацыяналізацыі і інтэнсіфікацыі адукацыйнага працэсу.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя Беларусі (другая палова XVI ст. – канец XVIII ст.)» павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў кампетэнцый:

УК-9 – Вяўляць фактары і механізмы гістарычнага развіцця, вызначаць грамадскае значэнне гістарычных падзей.

БПК-15 – Вылучаць асноўныя перыяды, тэндэнцыі і заканамернасці сацыяльных, эканамічных, палітычных, этна-нацыянальных, рэлігійна-канфесійных і культурных падзей і працэсаў, якія праходзяць на тэрыторыі Беларусі.

Пры вывучэнні кожнай тэмы студэнты павінны навучыцца карыстацца як канкрэтна-гістарычнымі метадамі (гісторыка-генетычным, гісторыка-параўнальным, гісторыка-тыпалагічным, гісторыка-сістэмным і інш.), так і агульнанавуковымі (мадэліравання, індукцыі і дэдукцыі, сінтэзу і аналізу, узыходжання ад канкрэтнага да абстрактнага і наадварот, аналогіі і інш.), метадамі гістарычнага пазнання.

У рамках адукацыйнага працэсу па дадзенай навучальнай дысцыпліне студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіваць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя Беларусі (другая палова XVI ст. – канец XVIII ст.)» на дзённай форме атрымання адукацыі па спецыяльнасці 1-02 01 01 «Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны», 1-02 01 02 «Гісторыя і сусветная мастацкая культура» і 1-02 01 03 «Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа» вучэбным планам адведзена ўсяго 108 гадзін (3 з.а.), з іх: аўдыторных – 58 гадзін: 24 гадзіны – лекцыйныя заняткі,

34 гадзіны – семінарскія заняткі (кіруемая самастойная работа студэнта – 12 гадзін); на самастойную работу – 50 гадзін, залік у 3 семестры.

На завочнай форме атрымання адукацыі па спецыяльнасці 1-02 01 01 «Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны» вучэбным планам адведзена ўсяго 108 гадзін (3 зал. адз.): з іх аўдыторных – 14 гадзін (6 гадзін – лекцый, 8 гадзін – семінарскіх заняткаў), на самастойную работу – 94 гадзіны, залік на 2 курсе.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Раздзел 1 Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае ў другой палове XVI – сярэдзіне XVII ст.

### Тэма 1.1 Усталяванне фальваркова-паншчыннай гаспадаркі і запрыгоньванне беларускага сялянства

Панская гаспадарка. Прычыны з'яўлення фальваркаў. Сялянскае землекарыстанне. «Устава на валокі» 1557 г. Катэгорыі сялянства паводле падаткаў і павіннасцей. Памер і нормы павіннасцей. Катэгорыі сялянства паводле характару асабістай залежнасці. Працэс запрыгоньвання сялянства. Этапы заканадаўчага афармлення прыгоннага права. Антыпрыгонніцкая барацьба беларускага сялянства.

### Тэма 1.2 Гарадское жыццё на беларускіх землях

Колькасны рост гарадоў і мястэчак. Гарадскія рамёствы і цэхавая арганізацыя. Унутраны і знешні гандаль беларускіх гарадоў. Магдэбургскае права. Войты і іх улада. Функцыі і дзейнасць магістрата. Юрыдыкі. Сацыяльныя групы і этнічны склад гарадскога насельніцтва. Сацыяльныя канфлікты ў гарадах. Гарадскія паўстанні.

### Тэма 1.3 Царква і рэлігія

Прывілеяванае становішча каталіцкага касцёла ў Вялікім Княстве Літоўскім. Прыкметы крызісу праваслаўнай царквы напрыканцы XVI ст. Рэфармацыя на беларускіх землях. Галоўныя плыні і дзеячы Рэфармацыі. Пачатак Контррэфармацыі. Езуіты і іх дзейнасць. Ідэя царкоўнай уніі. Прыхільнікі і праціўнікі уніі. Берасцейскі царкоўны сабор і стварэнне уніяцкай царквы. Барацьба вакол уніяцкага пытання ў канцы XVI – першай трэці XVII ст. Праваслаўныя брацтвы і іх дзейнасць.

### Тэма 1.4 Адраджэнне ў Беларусі

Заходнееўрапейскае Адраджэнне і Беларусь. Гуманізм. Дзеячы Адраджэння на Беларусі. Філасофскія погляды і гуманістычныя ідэалы Фр. Скарыны. Кнігадрукаванне. Выданні Скарыны і яго паслядоўнікаў. Грамадска-палітычная думка. Рэлігійна-палемічная літаратура. Праваслаўная публіцыстыка. Браты Зізаніі, М. Сматрыцкі, Л. Карповіч, А. Філіповіч. Ідэолагі каталіцтва і уніі. П. Скарга, І. Пацей. Сістэма адукацыі і навучальныя установы. Новыя рысы ў горадабудаўніцтве і архітэктуры. Выяўленчае мастацтва. Фарміраванне беларускай школы іканапісу. Тэатральнае і музычнае мастацтва.

## Раздзел 2 Беларускія землі ў другой палове XVII– XVIII ст.

### Тэма 2.1 Войны і сацыяльна-палітычныя канфлікты XVII – пачатку XVIII ст.

Антыфеадальная вайна ў Беларусі (1648-1651 гг.). Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай (1654-1667 гг.). Паглыбленне палітычнага крызісу ў першай палове XVIII ст. Беларусь у Паўночнай вайне (1700-1721 гг.). Вынікі войнаў XVII – пачатку XVIII ст. для Беларусі.

**Тэма 2.2 Эканамічны заняпад Беларусі пасля войнаў сярэдзіны XVII – пачатку XVIII ст. Сацыяльныя супярэчнасці**

Эканамічны заняпад Беларусі і яго прычыны. Інфляцыя. Распаўсюджванне фальваркава-паншчыннай сістэмы гаспадарання і панаванне ў эканоміцы буйных феадалаў. Сялянская і панская гаспадарка. Гарады і мястэчкі. Рамяство і гандаль. Эвалюцыя феадальнай рэнты. Дзяржаўныя падаткі. Абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцей у гарадах. Сялянскія хваляванні ў Крычаўскім старостве і на Каменшчыне.

**Тэма 2.3 Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у другой палове XVIII ст.**

Нармалізацыя эканамічнага жыцця ў Беларусі. Аднаўленне сельскай і гарадской гаспадаркі. Рост насельніцтва. Развіццё шляхоў зносін. Пачатак разлажэння феадалізму. Панская гаспадарка і спробы яе рацыяналізацыі. Рэфарматарская дзейнасць А.Тызенгаўза. Сялянская гаспадарка і катэгорыі сялян. Вотчынныя мануфактуры. Унутраны і знешні гандаль. Развіццё гарадоў. Вынікі і характар эканамічнага ажыўлення. Становішча гарадскога і сельскага насельніцтва.

**Тэма 2.4 Палітычны крызіс Рэчы Паспалітай. Далучэнне Беларусі да Расійскай імперыі**

Выбары Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Абвастрэнне палітычнай барацьбы паміж шляхецкімі групоўкамі ў 60 – пачатку 70-х гадоў XVIII ст. Умяшанне суседніх дзяржаў. Дысідэнцкае пытанне. Канфедэрацкі рух. Першы падзел Рэчы Паспалітай і далучэнне ўсходняй часткі Беларусі да Расіі. Абвастрэнне сацыяльнай напружанасці ў Рэчы Паспалітай у 80-я гг. XVIII ст. Шляхецка-буржуазны блок і яго дзейнасць. Рэформы Чатырохгадовага сойма. Канстытуцыя 3 мая 1791 г. Барацьба ўнутраных і знешніх сіл супраць канстытуцыі. Другі падзел Рэчы Паспалітай. Паўстанне 1794 г. Тадэвуш Касцюшка. Якуб Ясінскі. Міхаіл Клеафас Агінскі. Прычыны паражэння паўстання ў Вялікім Княстве Літоўскім і ў Рэчы Паспалітай. Трэці падзел Рэчы Паспалітай і ліквідацыя дзяржавы.

**Тэма 2.4 Культура Беларусі ў другой палове XVII–XVIII ст.**

Стан школьнай асветы і выхавання. Езуіцкія калегіумы. Праваслаўныя брацкія школы. Слуцкая гімназія. Тэатр. Інтэрмедыі. Батлейка. Літаратура. Кнігадрукаванне. Дзейнасць С.Полацкага, К.Лышчынскага, І.Капіевіча. Сарматызм як афіцыйная ідэалогія шляхты. Развіццё беларускага фальклору. Літаратура. Дыярыўшы. Архітэктура. Віленскае (Беларускае) барока. Скульптура, іконапіс. Стыль барока ў жывапісе. Развіццё дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Своеасаблівасць і супярэчлівасць эпохі Асветніцтва ў Беларусі. Пачатак секулярызацыі асветы і навукі. Дзейнасць Адукацыйнай камісіі. Галоўная школа Вялікага Княства Літоўскага. Гродзенская медыцынская школа. Дасягненні прыродазнаўчых навук. М.Пачобут-Адляніцкі. Ж. Жылібер. Ідэі Асветніцтва ў літаратуры і грамадскай думцы. С.Майман,

Т.Нарбут. І.Яленскі. Г.Каніскі. Фізіякраты. Мецэнацтва. Прыгонныя тэатры. Музычнае мастацтва. Камедыі К.Марашэўскага і М.Цяцерскага. Друк, першыя газеты. Архітэктура і жывапіс. Класіцызм. Палацава-сядзібнае будаўніцтва.

Беларуская народнасць у XVII–XVIII стст.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
## «Гісторыя Беларусі (другая палова XVI ст. – канец XVIII ст.)»
(дзённая форма атрымання адукацыі)

| Нумар раздела, тэмы, занятку | Назва раздзела, тэмы, занятку, пералік пытанняў, якія вывучаюцца | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Самастойная работа (пазааўдыторная) | Матэрыяльнае забеспячэнне занятку (наглядныя, метадычныя дапаможнікі і інш.) | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя (семінарскія) заняткі | Кіруемая самастойная работа студэнтаў | | | | |
| **3 семестр** | | | | | | | | |
| **1** | **Раздзел I. Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае ў другой палове XVI – сярэдзіне XVII ст.** | **8** | **6** | | **20** | | | |
| **1.1** | **Усталяванне фальваркова-паншчыннай гаспадаркі і запрыгоньванне беларускага сялянства**<br>1.Панская гаспадарка. Прычыны з’яўлення фальваркаў. Сялянскае землекарыстанне.<br>2«Устава на валокі» 1557 г.<br>3.Катэгорыі сялянства паводле падаткаў і характару асабістай залежнасці. Памер і нормы павіннасцей.<br>4.Этапы заканадаўчага афармлення прыгоннага права.<br>5.Антыпрыгонніцкая барацьба беларускага сялянства. | **2** | | | **4** | | | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **1.2** | **Гарадское жыццё на беларускіх землях**<br>1.Колькасны рост гарадоў і мястэчак.<br>2.Гарадскія рамёствы і цэхавая арганізацыя.<br>3.Унутраны і знешні гандаль беларускіх гарадоў. | **2** | | | **2** | Вялікі гістарычны атлас Беларусі. У 4 т. Т. 1. | | |
| 1.2.1 | 1.Магдэбургскае права.<br>2.Войты і іх улада.<br>3.Функцыі і дзейнасць магістрата. Юрыдыкі.<br>4.Сацыяльныя групы і этнічны склад гарадскога насельніцтва.<br>5.Сацыяльныя канфлікты ў гарадах. Гарадскія паўстанні. | | **2** | | **2** | | | Вуснае апытанне |
| **1.3.** | **Царква і рэлігія**<br>1.Прывілеяванае становішча каталіцкага касцёла ў Вялікім Княстве Літоўскім.<br>2.Прыкметы крызісу праваслаўнай царквы напрыканцы XVI ст.<br>3.Рэфармацыя на беларускіх землях.<br>4. Контррэфармацыі. Езуіты і іх дзейнасць.<br>5. Берасцейскі царкоўны сабор і стварэнне уніяцкай царквы. | **2** | | | **4** | Вялікі гістарычны атлас Беларусі. У 4 т. Т. 1. | | Прэзентацыя |
| **1.4** | **Адраджэнне ў Беларусі**<br>1.Заходнееўрапейскае Адраджэнне і Беларусь.<br>2.Гуманізм.<br>3.Дзеячы Адраджэння на Беларусі.<br>4.Філасофскія погляды і гуманістычныя ідэалы Фр. Скарыны. | **2** | | | **2** | | | |
| 1.4.1 | 1.Кнігадрукаванне. Выданні Скарыны і яго паслядоўнікаў.<br>2.Грамадска-палітычная думка.<br>3.Рэлігійна-палемічная літаратура.<br>4.Праваслаўная публіцыстыка. Браты Зізаніі, М. Сматрыцкі, Л. Карповіч, А. Філіповіч.<br>5.Ідэолагі каталіцтва і уніі. П. Скарга, І. Пацей. | | **2** | | **4** | | | Вуснае апытанне |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 6.Сістэма адукацыі і навучальныя ўстановы. | | | | | | | |
| 1.4.2 | 1.Новыя рысы ў горадабудаўніцтве і архітэктуры.<br>2.Выяўленчае мастацтва.<br>3.Фарміраванне беларускай школы іканапісу.<br>4.Тэатральнае і музычнае мастацтва. | | **2** | | **2** | Вялікі гістарычны атлас Беларусі. У 4 т. Т. 1. | | Тэст |
| **2** | **Раздзел ІІ. Беларускія землі ў другой палове XVII– XVIII ст.** | **10** | **22** | **12** | **30** | | | |
| **2.1** | **Войны і сацыяльна-палітычныя канфлікты XVII – пачатку XVIII ст. Паглыбленне палітычнага крызісу ў першай палове XVIII ст.**<br>1.Прадумовы сацыяльнага выбуху на беларускіх землях у сярэдзтне XVII ст.<br>2.Паўстанне пад кіраўніцтвам Б. Хмяльніцкага на Ўкраіне і яго роля ў разгортванні антыфеадальнага руху ў Беларусі.<br>3. Баявыя дзеянні казацка-сялянскіх атрадаў у вайне 1648 - 1651 гг. на поўдні і паўднёвым усходзе Беларусі.<br>4. Завяршэнне і вынікі казацка-сялянскай вайны. | 4 | | | 2 | Вялікі гістарычны атлас Беларусі: у 4 т. Т. 2. | [1] | |
| 2.1.1 | 1. Прычыны і пачатак вайна Расіі з Рэччу Паспалітай (1654-1667 гг.)<br>2. Ход і характар баявых дзеянняў.<br>3. Палітыка царскіх улад у Беларусі. Пазіцыя казацкай вярхушкі. Паводзіны шляхты і магнатаў.<br>4. Антыфеадальныя і антымаскоўскія выступленні сялян і гараджан. | | | **2(с)** | 2 | Вялікі гістарычны атлас Беларусі: у 4 т. Т. 2. | [1] | Тэст |
| 2.1.2 | 1.Умяшанне ў канфлікт Швецыі. Спробы аддзяліць Вялікае Княства Літоўскае ад Польшчы.<br>2. Вайсковая і палітычная дзейнасць Януша Радзівіла.<br>3. Кейданская ўнія. | | 2 | | 2 | | | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 4. Ваенныя дзеянні 1658 – 1666 гг. і іх вынікі.<br>5. Андросаўскае перамір`е. Страты Вялікага Княства Літоўскага. | | | | | | | |
| 2.1.3 | 1.Прычыны і пачатак Паўночнай вайны (1700-1721 гг.).<br>2.Ход баявых дзеянняў на тэрыторыі Беларусі.<br>3.Бітва пры Лясной і яе значэнне. Вынікі вайны для Беларусі.<br>4.Узмацненне расійскага уплыву ў Рэчы Паспалітай. | | 2 | | 2 | Вялікі гістарычны атлас Беларусі: у 4 т. Т. 2. | [1] | Вуснае апытанне |
| 2.1.4 | 1.Паглыбленне палітычнага крызісу ў першай палове XVIII ст. Арганізацыя ўлады і кіравання ў ВКЛ. Павятовыя і ваяводскія соймікі. Недзеяздольнасць вальных соймаў.<br>2. Палітычнае панаванне магнатаў у дзяржаве. Становішча дробнай і сярэдняй шляхты. Аслабленне каралеўскай улады. Узмацненне феадальнай анархіі.<br>3.Саперніцтва Радзівілаў, Пацаў і Сапегаў. Ваенны канфлікт паміж Сапегамі і беларуска-літоўскай шляхтай.<br>4. Спроба аддзялення Вялікага Княства Літоўскага ад Польшчы.<br>5. Рост уплыву каталіцкай царквы. Далейшае распаўсюджванне ўніяцтва. Становішча іншых канфесій. | | 2 | | 2 | | [1] | Эссэ |
| **2.2** | **Эканамічны заняпад Беларусі пасля войнаў сярэдзіны XVII – пачатку XVIII ст. Сацыяльныя супярэчнасці.**<br>1.Эканамічны заняпад Беларусі і яго прычыны.<br>2.Інфляцыя.<br>3.Рост буйнога феадальнага землеўладання.<br>4.Сялянская і панская гаспадарка.<br>5.Гарады і мястэчкі. Рамяство і гандаль. | | | **2(л.)** | 2 | | [1] | Прэзентацыя |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2.2.1 | 1.Эвалюцыя феадальнай рэнты. Дзяржаўныя падаткі.<br>2.Абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцей у гарадах.<br>3. Сялянскія хваляванні ў Крычаўскім старостве і на Каменшчыне. | | 2 | | 2 | | | Вуснае апытанне |
| **2.3** | **Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у другой палове XVIII ст.**<br>1.Нармалізацыя эканамічнага жыцця ў Беларусі. Аднаўленне сельскай і гарадской гаспадаркі.<br>2.Рост насельніцтва.<br>3.Развіццё шляхоў зносін.<br>4.Пачатак разлажэння феадалізму. | 2 | 2 | | | Вялікі гістарычны атлас Беларусі. У 4 т. Т. 2. | [1] | |
| 2.3.1 | 1.Панская гаспадарка і спробы яе рацыяналізацыі. Рэфарматарская дзейнасць А.Тызенгаўза.<br>2.Сялянская гаспадарка і катэгорыі сялян.<br>3.Вотчынныя мануфактуры.<br>4.Унутраны і знешні гандаль.<br>5.Развіццё гарадоў.<br>6.Вынікі і характар эканамічнага ажыўлення. Становішча гарадскога і сельскага насельніцтва. | | | **2(с)** | 2 | | | Вуснае апытанне |
| **2.4** | **Палітычны крызіс Рэчы Паспалітай. Далучэнне Беларусі да Расійскай імперыі**<br>1.Прычыны падзення Рэчы Паспалітай.<br>2.Абвастрэнне барацьбы паміж шляхецкімі групоўкамі ў 60 – пачатку 70-х гадоў XVIII ст.<br>3. Умяшанне суседніх дзяржаў. Дысідэнцкае пытанне. Канфедэрацкі рух.<br>4.Першы падзел Рэчы Паспалітай і далучэнне ўсходняй часткі Беларусі да Расіі. Абвастрэнне сацыяльнай напружанасці ў Рэчы Паспалітай у 80-я гг. XVIII ст.<br>5.Шляхецка-буржуазны блок і яго дзейнасць.<br>6.Рэформы Чатырохгадовага сойма. Канстытуцыя 3 мая 1791 г. Барацьба ўнутраных і знешніх сіл | 2 | 2 | | 2 | відэаролік | [1] | Прэзентацыя |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | супраць канстытуцыі. | | | | | | | |
| 2.4.1 | 1.Другі падзел Рэчы Паспалітай і далучэнне да Расіі цэнтральнай часткі Беларусі.<br>2.Тадэвуш Касцюшка. «Віленскія якабінцы». Якуб Ясінскі. Міхал Клеафас Агінскі.<br>3. Найвышэйшая Літоўская Рада. Пашырэнне паўстання на Беларусі. Фарміраванне і баявая дзейнасць паўстанцкіх атрадаў.<br>4. Адносіны да паўстання сялян. Паланецкі ўніверсал. Палітыка расійскага ўрада. Прычыны паражэння паўстання.<br>5. Трэці разбор Рэчы Паспалілітай і далучэнне да Расіі заходняй часткі Беларусі. | | 2 | | 2 | | | Вуснае апытанне |
| **2.5** | **Культура Беларусі ў другой палове XVII–XVIII ст.**<br>1. Гістарычныя ўмовы этнакультурнага развіцця. Афіцыйная забарона беларускай мовы. Працэс паланізацыі і яго вынікі.<br>2. Стан школьнай асветы і выхавання. Езуіцкія калегіўмы. Віленская акадэмія, яе роля ў распаўсюджванні навуковых ведаў.<br>3. "Вялікае мастацтва артылерыі" К.Семяновіча.<br>4. Тэатр. Інтэрмедыі. Батлейка. | 2 | 2 | **2(л.)** | 2 | Альбом ілюстрацый | [1] | Эссэ |
| 2.5.1 | 1. Літаратура. Кнігадрукаванне.<br>2. С.Полацкі і яго дзейнасць. А.Белабоцкі. К.Лышчынскі. І.Капіевіч.<br>3. Сарматызм як ідэалогія шляхты.<br>4. Архітэктура, скульптура і жывапіс.<br>5. Стыль барока. Развіццё прыкладнога мастацтва. | | 2 | | 2 | | | Даклады відэаролік |
| 2.5.2 | 1. Асветніцтва, своеасаблівасць і супярэчлівасць гэтай эпохі ў Беларусі.<br>2. Пачатак секулярызацыі асветы і навукі. Дзейнасць Адукацыйнай камісіі. Галоўная школа Вялікага | | | **2(с)** | 2 | | | Вуснае апытанне |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Княства Літоўскага. Гродзенская медыцынская школа.<br>3. Дасягненні прыродазнаўчых навук. М.Пачобут-Адляніцкі. Ж.Жылібер.<br>4. Ідэі Асветніцтва ў літаратуры і грамадскай думцы. С.Майман. Т.Нарбут. І.Яленскі. Г.Каніскі. | | | | | | | |
| 2.5.3 | 1. Фізіякраты. Мецэнацтва.<br>2. Прыгонныя тэатры.<br>3. Музычнае мастацтва. Камедыі К.Марашэўскага і М.Цяцерскага. Друк, першыя газеты.<br>4. Архітэктура і жывапіс. Класіцызм.<br>5. Палацава-сядзібнае будаўніцтва. | | 2 | | 2 | | | Даклады |
| 2.5.4 | **Беларуская народнасць у XVII–XVIII стст.**<br>1. Сацыяльна-эканамічныя і грамадска-палітычныя передумовы фарміравання беларускай народнасці.<br>2. Складванне этнічнай тэрыторыі, агульнай мовы і этнічнай самасвядомасці беларускай народнасці.<br>3. Гіпотэзы паходжання назвы «Белая Русь».<br>4. Саманазвы беларусаў. Адзінства матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускай народнасці. Грамадскі і сямейны побыт. | | 2 | **2(л.)** | 2 | Вялікі гістарычны атлас Беларусі. У 4 т. Т. 2. | [1] | Праверка канспектаў |
| | **Усяго** | **18** | **28** | **12** | **50** | | | **Залік** |

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
## «Гісторыя Беларусі (другая палова XVI ст. – канец XVIII ст.)»
па спецыяльнасці 1-02 01 01 «Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны»
(завочная форма атрымання адукацыі)

| Нумар раздела, тэмы, занятку | Назва раздзела, тэмы, занятку, пералік пытанняў, якія вывучаюцца | Колькасць аўдыторных гадзін | | Матэрыяльнае забеспячэнне занятку (наглядныя, метадычныя дапаможнікі і інш.) | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя (семінарскія) заняткі | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| **1.** | **Раздзел I. Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае ў другой палове XVI – сярэдзіне XVII ст.** | **2** | **2** | | | |
| 1.1 | **Войны другой паловы XVII– XVIII ст.**<br>1. Айчынная і замежная гістарыяграфія ваенных падзей у Беларусі другой паловы XVII – XVIII ст.<br>2. Баявыя дзеянні казацка-сялянскіх атрадаў у вайне 1648 - 1651 гг. на поўдні і паўднёвым усходзе Беларусі. Бітва пад Лоевам. Завяршэнне і вынікі казацка-сялянскай вайны.<br>3. Прычыны і характар вайны Расіі з Рэччу Паспалітай (1654-1667 гг.). Ваенныя дзеянні і іх вынікі.<br>4. Ход баявых дзеянняў на тэрыторыі Беларусі падчас Паўночнай вайны (1700-1721 гг.). Бітва пры | 2 | | Вялікі гістарычны атлас Беларусі. У 4 т. Т. 2. | [1] | Вуснае апытанне |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Лясной і яе значэнне. Вынікі вайны для Беларусі.<br>5. Узмацненне расійскага уплыву ў Рэчы Паспалітай. | | | | | |
| 1.1.1 | **Паглыбленне палітычнага крызісу ў першай палове XVIII ст.**<br>1. Аслабленне каралеўскай улады. Узмацненне феадальнай анархіі. Саперніцтва Радзівілаў, Пацаў і Сапегаў. Ваенны канфлікт паміж Сапегамі і беларуска-літоўскай шляхтай.<br>2. Спроба аддзялення Вялікага Княства Літоўскага ад Польшчы.<br>3. Рост уплыву каталіцкай царквы. Далейшае распаўсюджванне уніяцтва.<br>4. Становішча іншых канфесій. | | 2 | | [1] | Вуснае апытанне |
| **2.** | **Раздзел II. Беларускія землі ў другой палове XVII– XVIII ст.** | **4** | **6** | | | |
| 2.1 | **Стан эканомікі Беларусі (сярэдзіна XVII – канец XVIII ст.). Сацыяльныя супярэчнасці.**<br>1. Эканамічны заняпад Беларусі пасля войнаў сярэдзіны XVII – пачатку XVIII ст.<br>2. Сялянская і панская гаспадарка. Гарады і мястэчкі. Рамяство і гандаль сярэдзіны XVII – пачатку XVIII ст.<br>3. Сялянскія хваляванні ў Крычаўскім старостве і на Каменшчыне.<br>4. Нармалізацыя эканамічнага жыцця ў Беларусі **у** другой палове XVIII ст.<br>5. Панская гаспадарка і спробы яе рацыяналізацыі. Рэфарматарская дзейнасць А.Тызенгаўза.<br>6. Сялянская гаспадарка і катэгорыі сялян. Вотчынныя мануфактуры. Унутраны і знешні гандаль. Развіццё гарадоў. | 2 | | Вялікі гістарычны атлас Беларусі. У 4 т. Т. 2. | [1] | Праверка канспектаў |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 2.2 | **Палітычны крызіс Рэчы Паспалітай. Далучэнне Беларусі да Расійскай імперыі.**<br>1. Абвастрэнне барацьбы паміж шляхецкімі групоўкамі ў 60 – пачатку 70-х гадоў XVIII ст.<br>2. Умяшанне суседніх дзяржаў. Дысідэнцкае пытанне. Канфедэрацкі рух.<br>4. Першы падзел Рэчы Паспалітай і далучэнне ўсходняй часткі Беларусі да Расіі. Абвастрэнне сацыяльнай напружанасці ў Рэчы Паспалітай у 80-я гг. XVIII ст.<br>5. Шляхецка-буржуазны блок і яго дзейнасць. Рэформы Чатырохгадовага сойма. Канстытуцыя 3 мая 1791 г. Барацьба ўнутраных і знешніх сіл супраць канстытуцыі. | 2 | | Вялікі гістарычны атлас Беларусі. У 4 т. Т. 2. | [1] | Справаздача па індывідуальных заданнях |
| 2.2.1 | 1. Другі падзел Рэчы Паспалітай і далучэнне да Расіі цэнтральнай часткі Беларусі.<br>2. Тадэвуш Касцюшка. «Віленскія якабінцы». Якуб Ясінскі. Міхал Клеафас Агінскі.<br>3. Найвышэйшая Літоўская Рада. Пашырэнне паўстання ў Беларусі. Фарміраванне і баявая дзейнасць паўстанцкіх атрадаў.<br>4. Адносіны да паўстання сялян. Паланецкі ўніверсал. Палітыка расійскага ўрада. Прычыны паражэння паўстання.<br>5. Трэці падзел Рэчы Паспалілітай і далучэнне да Расіі заходняй часткі Беларусі. | | 2 | | | Вуснае апытанне |
| 2.3 | **Культура Беларусі ў другой палове XVII–XVIII ст.**<br>1. Гістарычныя ўмовы этнакультурнага развіцця. Афіцыйная забарона беларускай мовы. Працэс паланізацыі і яго вынікі.<br>2. Стан школьнай асветы і выхавання. Езуіцкія калегіўмы. Віленская акадэмія, яе роля ў | | 2 | Вялікі гістарычны атлас Беларусі. У 4 т. Т. 2. | | Даклады |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | распаўсюджванні навуковых ведаў.<br>3. “Вялікае мастацтва артылерыі” К.Семяновіча.<br>4. Тэатр. Інтэрмедыі. Батлейка. | | | | | |
| 2.3.1 | 1. Літаратура. Кнігадрукаванне. С.Полацкі і яго дзейнасць. А.Белабоцкі. К.Лышчынскі. І.Капіевіч.<br>3. Сарматызм як ідэалогія шляхты.<br>4. Архітэктура скульптура і жывапіс. Стыль барока.<br>5. Асветніцтва, своеасаблівасць і супярэчлівасць гэтай эпохі на Беларусі. Пачатак секулярызацыі асветы і навукі.<br>6. Дасягненні прыродазнаўчых навук. М.Пачобут-Адляніцкі. Ж.Жылібер. Фізіякраты. Мецэнацтва.<br>7. Прыгонныя тэатры. Музычнае мастацтва. Камедыі К.Марашэўскага і М.Цяцерскага. Друк, першыя газеты.<br>8. Архітэктура і жывапіс. Класіцызм. Палацава-сядзібнае будаўніцтва. | | 2 | | [1] | Відэаролік |
| | **Усяго** | **6** | **8** | | | **Залік** |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная літаратура**

1. Гісторыя Беларусі [Электронны рэсурс] : вучэб.-метад. комплекс для спецыяльнасцей 1-02 01 01 «Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны», 1-02 01 02 «Гісторыя і сусветная мастацкая культура», 1-02 01 03 «Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа» / склад.: М. М. Сакалоў [і інш.] // Репозиторий БГПУ. – Рэжым доступу: http://elib.bspu.by/handle/doc/249. – Дата доступу: 25.03.2022.

**Дадатковая літаратура**

1. Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / рэдкал.: А. А. Воінаў [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 1993. – 620 с.

2. Беларускія летапісы і хронікі / уклад. У. Арлова. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 1997. – 430 с.

3. Вішнеўскі, А. Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах (са старажытных часоў да нашых дзен) : вучэб. дапам. / А. Ф. Вішнеўскі, Я. А. Юхо. – Мінск : Акад. М-ва унутр. спраў, 2003. – 320 с.

4. Вялікае княства Літоўскае: ВКЛ: энцыклапедыя: у 3 т. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 2005-2010.

5. Вялікі гістарычны атлас Беларусі: у 4 т. – Т. 2. – Мінск: Белкартаграфія, 2013. – 374 с.

6. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2004–2007. – Т. 2 : Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага / Ю. Бохан [і інш.]. – 2008. – 688 с.

7. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2004–2007. – Т. 3 : Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стст.) / Ю. Бохан [і інш.]. – 2004. – 344 с.

8. Гісторыя беларускага мастацтва : у 6 т. / рэдкал.: С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1988. – Т. 2 : Другая палова XVI ст. – канец XVIII ст. – 384 с.

9. Гісторыя сялянства Беларусі : у 3 т. / пад рэд. В. І. Мялешкі [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 1997. – Т. 1 : Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытнасці да 1861 г. – 431 с.

10. Грицкевич, А. П. Социальная борьба горожан Белоруссии (XVI–XVIII вв.) / А. П. Грицкевич. – Минск : Наука и техника, 1979. – 150 с.

11. Грицкевич, А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI–XVIII вв.: (социально-экономическое исследование истории городов) / А. П. Грицкевич. – Минск : Наука и техника, 1975. – 247 с.

12. Доўнар-Запольскі, М. В. Гісторыя Беларусі / М. В. Доўнар-Запольскі. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 1994. – 509 с.

13. История белорусской государственности : в 5 т. / редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2018–2020. – Т. 1 : Белорусская государственность: от истоков до конца XVIII в. – 2018. – 598 с.

14. Мальдзіс, А. І. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя: нарысы быту і звычаяў / А. Мальдзіс. – Мінск : Маст. літ., 1982. – 254 с.

15. Марозава, С. В. Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596–1839 гады) / С. В. Марозава. – Гродна : Гродзен. дзярж. ун-т, 2001. – 352 с.

16. Мысліцелі і асветнікі Беларусі, X—XIX стагоддзі: энцыклапедычны даведнік / рэдкал.: Б. І. Сачанка [і інш.]. – Мінск : БелЭН, 1995. – 670 с.

17. Россия и белорусские земли в XVII – первой половине XVIII в. : сб. док. / А. Б. Довнар [и др.]. – М. : Древлехранилище, 2020. – Т. 1 : 1619–1663 гг. – 428 с.

18. Рэлігія і царква на Беларусі : энцыкл. давед. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2001. – 368 с.

19. Ткачоў, М. А. Замкі і людзі / М. А. Ткачоў ; пад рэд. Г. В. Штыхава. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 182 с.

20. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / М. В. Біч [і інш.]. – Мінск: Беларус. Энцыкл., 1993-2003. – 6 т.

21. Юхо, Я. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : вучэбн. дапам. / Я. А. Юхо. – Мінск : Рэсп. ін-т выш. шк., 2000. – 352 с.

## Прыкладны спіс пытанняў да заліку па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя Беларусі (другая палова XVI – канец XVIII ст.)»

1. Айчынная і замежная гістарыяграфія ваенных падзей у Беларусі (другая палова XVI – канец XVIII ст.).
2. Усталяванне фальваркова-паншчыннай гаспадаркі і запрыгоньванне беларускага сялянства.
3. Гарадское жыццё на беларускіх землях ў другой палове XVI – сярэдзіне XVII ст.
4. Царква і рэлігія на беларускіх землях ў другой палове XVI – сярэдзіне XVII ст.
5. Адраджэнне ў Беларусі (XVI ст.).
6. Казацка-сялянская вайна 1648-1651 гг. на землях Беларусі: прычыны, характар, ход баявых дзеянняў. Белацаркоўскі дагавор 1651 г.
7. Галоўныя прычыны, характар і пачатак вайны Расіі з Рэччу Паспалітай (1654-1667 гг.).
8. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі ў час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай (1654-1667 гг.). Андрусаўскае перамір'е 1667 г. Вынікі вайны для Беларусі.
9. Барацьба магнацкіх груповак у Рэчы Паспалітай (другая палова XVII-XVIII стст.).
10. Перадумовы Вялікай Паўночнай вайны і яе пачатак. Баявыя дзеянні ў Беларусі.
11. Завяршэнне Паўночнай вайны і яе вынікі для Беларусі і Рэчы Паспалітай.
12. Сельская гаспадарка Беларусі ў другой палове XVII – пачатку XVIII ст. Распаўсюджванне фальваркава-паншчыннай сістэмы гаспадарання і панаванне ў эканоміцы буйных феадалаў.
13. Становішча сельскай гаспадаркі ў другой палове XVIII ст. Фальваркавая вытворчасць і промыслы.
14. Аграрная рэформа Антонія Тызенгаўза. Магнацкае прадпрымальніцтва.
15. Беларускія гарады ў XVII-XVIII стст. і іх насельніцтва. Крыніцы росту. Мястэчкі.
16. Развіццё гандлю ў Беларусі ў другой палове XVIII ст.
17. Паўстанне сялян пад кіраўніцтвам В. Вашчылы ў Крычаўскім старостве. Паўстанне на Каменшчыне.
18. Дзяржаўныя рэформы другой паловы 60-х гг. XVIII ст. ў Рэчы Паспалітай. Прыход да ўлады Станіслава Аўгуста Панятоўсага.
19. Дысідэнцкае пытанне ў Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст. Стварэнне Слуцкай, Радомскай і Віленска-Радомска-Торуньскай канфедэрацый.
20. Барская канфедэрацыя. Канфедэрацкі рух на беларускіх землях. Першы падзел Рэчы Паспалітай.
21. Спробы рэфармавання Рэчы Паспалітай. Чатырохгадовы сейм (1788-1792) і значэнне яго для Беларусі. Канстытуцыя 3 мая 1791 г.
22. Таргавіцкая канфедэрацыя. Другі падзел Рэчы Паспалітай.

23. Паўстанне пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі (1794 г.). Асаблівасці паўстання ў Беларусі і Літве.
24. Паражэнне паўстання Т. Касцюшкі. Трэці падзел Рэчы Паспалітай.
25. Стан школьнай асветы і выхавання. Езуіцкія калегіўмы. Віленская акадэмія, яе роля ў распаўсюджванні навуковых ведаў у другой палове XVII – XVIII ст.
26. "Вялікае мастацтва артылерыі" К.Семяновіча.
27. Тэатр. Інтэрмедыі. Батлейка.
28. Літаратура. Кнігадрукаванне. С. Полацкі і яго дзейнасць. А.Белабоцкі. К.Лышчынскі. І.Капіевіч.
29. Архітэктура, скульптура і жывапіс. Стыль барока.
30. Дасягненні прыродазнаўчых навук. М.Пачобут-Адляніцкі. Ж.Жылібер. Фізіякраты. Мецэнацтва.
31. Прыгонныя тэатры. Музычнае мастацтва. Камедыі К.Марашэўскага і М.Цяцерскага.
32. Архітэктура і жывапіс. Класіцызм. Палацава-сядзібнае будаўніцтва.

# Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя Беларусі (другая палова XVI – канец XVIII ст.)»

Мэтай метадычных рэкамендацый з'яўляецца павышэнне эфектыўнасці вучэбнага працэсу, у тым ліку за кошт самастойнай работы, падчас якой студэнт становіцца актыўным суб'ектам навучання, што азначае:

— здольнасць займаць у навучанні актыўную пазіцыю;

— падрыхтаванасць мабілізаваць інтэлектуальныя і валявыя намаганні для дасягнення вучэбных мэт;

— уменні праектаваць, планаваць і прагназаваць вучэбную дзейнасць, а таксама ініцыяваць сваю пазнавальную дзейнасць на падставе ўнутранай станоўчай матывацыі;

— усведамленне сваіх патэнцыяльных вучэбных магчымасцей і псіхалагічную падрыхтаванасць да складання праграмы дзейнасці па самаразвіцці.

**Віды самастойнай работы студэнтаў**

| | |
|---|---|
| Рэпрадуктыўная самастойная работа | Самастойнае чытанне, прагляд, канспектаванне вучэбнай літаратуры, запамінанне, пераказ, паўтарэнне вучэбнага матэрыялу і г. д. |
| Пазнавальна-пошукавая самастойная работа | Падрыхтоўка паведамленняў, дакладаў, выступленняў на семінарскіх і практычных занятках, падбор адпаведнай літаратуры, напісанне дыпломных работ і г. д. |
| Творчая самастойная работа | Удзел у навукова-даследчай рабоце, навуковых мерапрыемствах, выкананне творчых праектаў па індывідуальных і групавых заданнях і г. д. |

## Арганізацыя і кантроль самастойнай работы

Для паспяховага выканання самастойнай работы студэнтаў неабходна планаванне і кантроль з боку выкладчыкаў. Аўдыторная самастойная работа выконваецца студэнтамі на лекцыя і семінарскіх занятках. Для гэтага выкладчык загадзя распрацоўвае і выбудоўвае сістэму самастойнай работы, улічваючы ўсе яе формы, мэты, ажыццяўляе адбор неабходнай інфармацыі і сродкі (метадчных) камунікацый, вызначае ролю студэнта ў гэтым працэсе і свой удзел у ім. Пытанні для самастойнай работы студэнтаў, якія прыведзены ў рабочай праграме дысцыпліны, прапануюцца выкладчыкамі напачатку вывучэння дысцыпліны. Студэнты маюць права дадаткова выбіраць тэмы, якія іх цікавяць, для самастойнай работы.

**Змест дзейнасці выкладчыка і студэнта пры выкананні самастойнай работы**

| Асноўныя характарыстыкі | Дзейнасць выкладчыка | Дзейнасць студэнтаў |
|---|---|---|
| Мэта выканання СР | - тлумачыць мэту і сэнс выканання СР;<br>- дае разгорнуты ці кароткі інструктаж пра патрабаванні, якія прад'яўляюцца да СР і спосабах яе выканання;<br>- дэманструе ўзор СР | - асэнсоўвае і прымае мэту СР як асабіста значную;<br>- знаёміцца з патрабаваннямі да СР |
| Матывацыя | - раскрывае тэарэтычную і практычную значнасць выканання СР, фарміруе ў студэнта пазнавальную патрэбнасць і падрыхтаванасць да выканання СР;<br>- надае студэнту матывацыю для дасягнення поспеху | - фарміруе ўласную пазнавальную патрэбнасць у выкананні СР;<br>- фарміруе ўстаноўку і прымае рашэнне аб выкананні СР |
| Кіраванне | - ажыццяўляе кіраванне шляхам мэтанакіраванага ўздзеяння на працэс выканання СР;<br>- дае агульныя арыенціры выканання СР | - ажыццяўляе планаванне і праектаванне СР, а таксама рацыянальнае размеркаванне часу, неабходнага для яе выканання |
| Кантроль і карэкцыя выканання СР | - ажыццяўляе папярэдні кантроль, які прадугледжвае выяўленне зыходнага ўзроўню падрыхтаванасці студэнта да выканання СР;<br>- ажыццяўляе выніковы кантроль канчатковага вынікаў выканання СР | - ажыццяўляе бягучы самакантроль за ходам выканання СР;<br>- выяўляе, аналізуе і выпраўляе дапушчаныя памылкі і ўносіць карэктывы ў работу;<br>- праводзіць пошук аптымальных спосабаў выканання СР;<br>- ажыццяўляе рэфлексію ўласнай дзейнасці;<br>- ажыццяўляе выніковы самакантроль вынікаў СР |
| Ацэнка | - на падставе параўнання вынікаў з эталонам, загадзя зададзенымі крытэрыямі дае ацэнку СР; | - на падставе параўнання вынікаў з мэтай дае самаацэнку сваім пазнавальным |

| | | |
|---|---|---|
| | - выяўляе тыповыя памылкі, акцэнтуе ўвагу на станоўчых і адмоўных баках, дае метадычныя парады па выкананні СР, вызначае далейшыя кірункі выканання СР;<br>- устанаўлівае ўзровень і вызначае якасць самастойнай дзейнасці студэнта, на падставе чаго фарміруе ў апошняга матывацыю дасягнення поспеху ў вучэбнай дзейнасці | магчымасцям, здольнасцям і якасцям |

Пазааўдыторная самастойная работа студэнтаў (далей – самастойная работа) – вучэбная, вучэбна-даследчая, навукова-даследчая дзейнасць студэнтаў, якая ажыццяўляецца ў пазааўдыторны час па заданні і пры метадычным кіраўніцтве выкладчыка, але без яго непасрэднага ўдзелу. Яна прадугледжвае:

– падрыхтоўку да аўдыторных заняткаў і выкананне адпаведных заданняў;

– самастойную работу па вывучэнні тэм вучэбных дысцыплін у адпаведнасці з вучэбнымі праграмамі;

– выкананне кантрольных работ;

– удзел у навуковых мерапрыемствах (выставы, канферэнцыі, сімпозіумы, семінары і г. д.).

Выкананне студэнтамі любога віду самастойнай работы прадугледжвае наступныя этапы:

– пастаноўка мэты самастойнай работы;

– канкрэтызацыя пазнавальнай задачы;

– самаацэнка падрыхтаванасці да самастойнай работы па вырашэнні пастаўленай задачы;

– выбар адпаведных сродкаў вырашэння пастаўленай задачы;

– планаванне самастойнай работы па вырашэнні задач самастойна альбо пры дапамозе выкладчыка;

– рэалізацыя праграмы выканання самастойнай работы.

## Патрабаванні да выканання самастойнай работы студэнтаў

| № п/п | Назва тэмы, раздзела | Колькасць гадзін на СРС | Заданне | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Антыфеадальная вайна ў Беларусі (1648-1651 гг.) | 4 | Прадумовы сацыяльнага выбуху. Паўстанне пад кіраўніцтвам Б. Хмяльніцкага на Украіне і яго роля ў разгортванні антыфеадальнага руху ў Беларусі. Сацыяльна-саслоўны склад паўстанцаў. Баявыя дзеянні казацка-сялянскіх атрадаў і шляхецкага апалчэння на поўдні і паўднёвым усходзе Беларусі. Завяршэнне і вынікі казацка-сялянскай вайны. | Падрыхтоўка паведамленняў |
| 2 | Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай (1654-1667 гг.) | 4 | Прычыны і пачатак вайны. Антыфеадальныя і антымаскоўскія выступленні сялян і гараджан. Умяшанне ў канфлікт Швецыі. Спробы аддзяліць Вялікае Княства Літоўскае ад Польшчы. Вайсковая і палітычная дзейнасць Януша Радзівіла. Кейданская унія. Ваенныя дзеянні 1658-1666 гг. і іх вынікі. Андрусаўскае перамір'е. Страты Вялікага Княства Літоўскага. | Падрыхтоўка паведамленняў |
| 3 | Беларусь у Паўночнай вайне (1700-1721 гг.) | 4 | Прычыны і пачатак Паўночнай вайны. Адносіны насельніцтва да ваюючых бакоў. Выступленні шляхецкіх груповак. Выкарыстанне казацка-сялянскіх атрадаў. Выбранне каралём Станіслава Ляшчынскага. Сандамірская канфедэрацыя. Бітва пры Лясной. Вынікі вайны для Беларусь Узмацненне расійскага ўплыву ў Рэчы Паспалітай. | Справаздача па індывідуальных заданнях |
| 4 | Паглыбленне палітычнага крызісу ў першай палове XVIII ст. | 8 | Аслабленне каралеўскай улады. Узмацненне феадальнай анархіі. Саперніцтва Радзівілаў, Пацаў і Сапегаў. Ваенны канфлікт паміж Сапегамі і антысапежанскай кааліцыяй. Спроба аддзялення Вялікага Княства Літоўскага ад Польшчы. Рост уплыву каталіцкай царквы. Далейшае распаўсюджванне ўніяцтва. | Падрыхтоўка прэзентацый |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 5 | Эканамічны заняпад Беларусі пасля войнаў сярэдзіны XVII – пачатку XVIII ст. Сацыяльныя супярэчнасці. | 4 | Распаўсюджванне фальваркава-паншчыннай сістэмы гаспадарання і панаванне ў эканоміцы буйных феадалаў. Сялянская і панская гаспадарка. Гарады і мястэчкі. Рамяство і гандаль. Эвалюцыя феадальнай рэнты. Дзяржаўныя падаткі. Абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцяў у гарадах. Сялянскія хваляванні ў Крычаўскім старостве і на Каменшчыне. | Падрыхтоўка дакладаў |
| 6 | Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у другой палове XVIII ст. | 4 | Нармалізацыя эканамічнага жыцця ў Беларусі Аднаўленне сельскай і гарадской гаспадаркі. Рост насельніцтва. Развіццё шляхоў зносін. Пачатак разлажэння феадалізму. Панская гаспадарка і спробы яе рацыяналізацыі. Рэфарматарская дзейнасць А.Тызенгаўза. Сялянская гаспадарка і катэгорыі сялян. Вотчынныя мануфактуры. Унутраны і знешні гандаль. Развіццё гарадоў. Вынікі і характар эканамічнага ажыўлення. Становішча гарадскога і сельскага насельніцтва. | Справаздача па індывідуальных заданнях |
| 7 | Палітычны крызіс Рэчы Паспалітай. Далучэнне Беларусі да Расійскай імперыі. | 8 | Абвастрэнне палітычнай барацьбы паміж шляхецкімі групоўкамі ў 60 - пачатку 70-х гадоў XVIII ст. Умяшанне суседніх дзяржаў. Дысідэнцкае пытанне. Канфедэрацкі рух. Першы падзел Рэчы Паспалітай і далучэнне ўсходняй часткі Беларусі да Расіі. Рэформы Чатырохгадовага сойма. Канстытуцыя 3 мая 1791 г. Паўстанне 1794 г. Трэці раздзел Рэчы Паспалітай і ліквідацыя дзяржавы. | Справаздача па індывідуальных заданнях |
| 8 | Культура Беларусі ў другой палове XVII–XVIII ст. | 12 | Стан школьнай асветы і выхавання. Сарматызм як афіцыйная ідэалогія шляхты. Літаратура. Архітэктура. Віленскае (Беларускае) барока. Скульптура, іконапіс. Стыль барока ў жывапісе. Развіццё дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Своеасаблівасць і супярэчлівасць эпохі Асветніцтва на Беларусі. Фізіякраты. Мецэнацтва. Прыгонныя тэатры. | Падрыхтоўка дакладаў |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 9 | Беларуская народнасць у XVII–XVIII ст. | 2 | Сацыяльна-эканамічныя і грамадска-палітычныя перадумовы фарміравання беларускай народнасці. Складванне этнічнай тэрыторыі, агульнай мовы і этнічнай самасвядомасці беларускай народнасці. Саманазвы беларусаў. Адзінства матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускай народнасці. Грамадскі і сямейны побыт. | Падрыхтоўка прэзентацый |
| | **Всего** | **50** | | |

## Пералік заданняў і кантрольных мерапрыемстваў кіруемай самастойнай работы студэнта

| № п/п | Назва тэмы | Колькасць гадзін на КСРс | | Заданне | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|---|
| | | лекц. | сем. | | |
| 1 | Войны і сацыяльна-палітычныя канфлікты XVII – пачатку XVIII ст. | | 2 | **Першы модуль**<br>1. Прычыны і пачатак вайна Расіі з Рэччу Паспалітай (1654-1667 гг.)<br>2. Ход і характар баявых дзеянняў.<br>**Другі модуль**<br>3. Палітыка царскіх улад у Беларусі. Пазіцыя казацкай вярхушкі. Паводзіны шляхты і магнатаў.<br>**Трэці модуль**<br>4. Антыфеадальныя і антымаскоўскія выступленні сялян і гараджан. | Канспект па тэме на падставе зместу вучэбнай літаратуры і інтэрнет-рэсурсаў<br>Даклады<br>Творчыя праекты |
| 2 | Эканамічны заняпад Беларусі пасля войнаў сярэдзіны XVII – пачатку XVIII ст. Сацыяльныя супярэчнасці. | 2 | | **Першы модуль**<br>1.Эканамічны заняпад Беларусі і яго прычыны.<br>2.Інфляцыя.<br>**Другі модуль**<br>3.Рост буйнога феадальнага землеўладання.<br>4.Сялянская і панская гаспадарка.<br>5.Гарады і мястэчкі. Рамяство і гандаль. | Канспект па тэме на падставе зместу вучэбнай літаратуры і інтэрнет-рэсурсаў<br>Даклады<br>Творчыя праекты па групавых заданнях |
| 3 | Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у другой палове XVIII ст. | | 2 | **Першы модуль**<br>1.Панская гаспадарка і спробы яе рацыяналізацыі. Рэфарматарская дзейнасць А.Тызенгаўза.<br>**Другі модуль**<br>2.Сялянская гаспадарка і катэгорыі сялян.<br>3.Вотчынныя мануфактуры.<br>4.Унутраны і знешні гандаль. | Канспект па тэме на падставе зместу вучэбнай літаратуры і інтэрнет-рэсурсаў<br>Даклады |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | **Трэці модуль**<br>5.Развіццё гарадоў.<br>6.Вынікі і характар эканамічнага ажыўлення. Становішча гарадскога і сельскага насельніцтва. | Творчыя праекты па групавых заданнях |
| 4 | Культура Беларусі ў другой палове XVII – XVIII ст. | **2** | | **Першы модуль**<br>1. Гістарычныя ўмовы этнакультурнага развіцця. Афіцыйная забарона беларускай мовы. Працэс паланізацыі і яго вынікі.<br>2. Стан школьнай асветы і выхавання. Езуіцкія калегіўмы. Віленская акадэмія, яе роля ў распаўсюджванні навуковых ведаў.<br>**Другі модуль**<br>3. “Вялікае мастацтва артылерыі” К.Семяновіча.<br>**Трэці модуль**<br>4. Тэатр. Інтэрмедыі. Батлейка. | Канспект па тэме на падставе зместу вучэбнай літаратуры і інтэрнет-рэсурсаў<br>Даклады<br>Творчыя праекты па групавых заданнях |
| 5 | Культура Беларусі ў другой палове XVII – XVIII ст. | | **2** | **Першы модуль**<br>1. Асветніцтва, своеасаблівасць і супярэчлівасць гэтай эпохі ў Беларусі.<br>2. Пачатак секулярызацыі асветы і навукі. Дзейнасць Адукацыйнай камісіі. Галоўная школа Вялікага Княства Літоўскага. Гродзенская медыцынская школа.<br>**Другі модуль**<br>3. Дасягненні прыродазнаўчых навук. М.Пачобут-Адляніцкі. Ж.Жылібер.<br>**Трэці модуль**<br>4. Ідэі Асветніцтва ў літаратуры і грамадскай думцы. С.Майман. Т.Нарбут. І.Яленскі. Г.Каніскі. | Канспект па тэме на падставе зместу вучэбнай літаратуры і інтэрнет-рэсурсаў<br>Даклады<br>Творчыя праекты па групавых заданнях |
| 6 | Беларуская народнасць у XVII – XVIII ст. | | **2** | **Першы модуль**<br>1. Сацыяльна-эканамічныя і грамадска-палітычныя перадумовы фарміравання беларускай народнасці. | Канспект па тэме на падставе зместу вучэбнай літаратуры і інтэрнет-рэсурсаў |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 2. Складванне этнічнай тэрыторыі, агульнай мовы і этнічнай самасвядомасці беларускай народнасці.<br>**Другі модуль**<br>3. Гіпотэзы паходжання назвы «Белая Русь».<br>**Трэці модуль**<br>4. Саманазвы беларусаў. Адзінства матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускай народнасці. Грамадскі і сямейны побыт. | Даклады<br><br>Творчыя праекты па групавых заданнях |
| | **Усяго** | **6** | **6** | | |

## Метадычныя парады і рэкамендацыі да заданняў

Усе тыпы заданняў, што выконваюцца студэнтамі, у тым ліку ў працэсе самастойнай работы, так ці інакш ўтрымліваюць устаноўку на набыццё і замацаванне вызначанага Дзяржаўным адукацыйным стандартам вышэйшай прафесійнай адукацыі аб'ёму ведаў, а таксама на фарміраванне ў рамках гэтых ведаў некаторых навыкаў разумовых аперацый – умення ацэньваць, аналізаваць, параўноўваць, каментаваць і г. д. Некаторыя заданні патрабуюць тлумачэння:

1. Пракаментаваць выказванне – растлумачыць, якая ідэя заключана ва урыўку, аб якой пазіцыі яе аўтара яна сведчыць.

2. Параўнаць – выявіць падабенства і адрозненне па пэўных прыкметах.

3. Абгрунтаваць адзін з некалькіх прапанаваных варыянтаў адказу – прывесці аргументы на карысць правільнасці выбранага варыянту адказу і паказаць, у чым памылковасць іншых варыянтаў.

5. Правесці аналіз – раскласці вывучаемыя з'явы на складовыя часткі, супаставіць іх з мэтай выяўлення ў іх істотнага, неабходнага і вызначальнага.

6. Тэзісна выкласці ідэю, канцэпцыю, тэорыю – выкарыстоўваючы матэрыял вучэбных дапаможнікаў і іншай літаратуры, коратка, але не на шкоду зместу сфармуляваць асноўныя палажэнні.

7. Адлюстраваць схематычна – раскрыць змест адказу лаканічна, абагульнена, пры неабходнасці ў выглядзе розных графічных формаў (схема, табліца, малюнак і г. д.).

Важным складнікам самастойнай пазааўдыторнай падрыхтоўкі з'яўляецца праца з літаратурай да ўсіх відаў заняткаў: семінарскіх, практычных, пры падрыхтоўцы да залікаў, экзаменаў, тэсціраванняў, удзелу ў навуковых мерапрыемствах.

Уменне працаваць з літаратурай азначае навучыцца асэнсавана карыстацца крыніцамі. Перш чым прыступіць да засваення зместу спецыяльнай навуковай літаратуры, рэкамендуецца чытанне падручнікаў і навучальных дапаможнікаў.

Вывучэнне навуковай, вучэбнай і іншай літаратуры патрабуе вядзення працоўных запісаў.

Формы запісаў могуць быць разнастайнымі: просты або разгорнуты план, тэзісы, цытаты, канспект.

Студэнтам рэкамендуецца самастойна выконваць даклады, індывідуальныя пісьмовыя заданні і практыкаванні, прапанаваныя пры падрыхтоўцы да семінарскіх заняткаў. Праца, звязаная з рашэннем гэтых задач і практыкаванняў, уяўляе сабой выгляд інтэлектуальнай практычнай дзейнасці. Яна спрыяе выпрацоўцы ўмення і звычкі выконваць задачы правільна, а таксама замацаванню навыкаў і ведаў па праблеме.

## Метадычныя рэкамендацыі па напісанні пісьмовых, навукова-даследчых работ студэнтаў

Напісанне пісьмовых, навукова-даследчых работ студэнтаў вырашае шэраг задач:

— навучанне студэнтаў самастойнаму пошуку і адбору вучэбнай і спецыяльнай навуковай літаратуры па прадмеце;

— прывіццё навыкаў рэферыравання навуковых артыкулаў па праблематыцы вывучаемых дысцыплін;

— выпрацоўка ўмення падрыхтоўкі паведамленняў, дакладаў і выступленняў;

— набыццё вопыту выступленняў з дакладамі на семінарскіх занятках;

— сістэматызацыя, замацаванне і пашырэнне ведаў і навыкаў па вывучаемых дысцыплінах;

— далучэнне студэнтаў да вырашэння праблемных пытанняў па абранай тэме работы;

— навучанне студэнтаў выкладаць матэрыял у выглядзе стройнай сістэмы тэарэтычных палажэнняў, звязаных лагічнай паслядоўнасцю і абгрунтаваных.

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

Для дыягностыкі кампетэнцый могуць выкарыстоўвацца наступныя формы:

1. Вусная форма:
– гутарка;
– даклады на семінарах;
– вусная прэзентацыя вынікаў самастойнай работы студэнтаў;
– залік;
– эссэ;
– справаздачы па індывідуальных заданнях;
– творчыя заданні
2. Пісьмовая форма:
– пісьмовыя кантрольныя работы;
– тэсты;
– пісьмовая прэзентацыя вынікаў самастойнай работы студэнтаў.

## Крытэрыі ацэнак вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнта

### Не залічана

Адсутнасць адказу або адмова ад адказу. Распазнанне аб’екта вывучэння, асобных тэрмінаў і фактаў, праявы імкнення пераадолець вучэбныя цяжкасці, праяўленне інтарэсу да вывучэння прадмета, адлічча вызначэнняў, стуктурных элементаў ведаў, праявы валявых намаганняў і матывацыя вучэння.

### Залічана

Няпоўнае знанне праграмнага матэрыялу на ўзроўні памяці, наяўнасць значных, але выпраўленых з дапамогай выкладчыка памылак, цяжкасці ў прымяненні спецыяльных і інтэлектуальных уменняў, імкненне да пераадолення цяжкасцей, праяўленне адказнасці, самакрытычнасці. Асваенне вучэбнага матэрыялу на рэпрадукцыйным узроўні і няпоўнае яго ўзнаўленне, наяўнасць памылак, якія можна выправіць пры дадатковых пытаннях. Усвядомленае ўзнаўленне праграмнага матэрыялу, у тым ліку рознай ступені складанасці, з некаторымі памылкамі. Поўнае ўзнаўленне праграмнага матэрыялу, у тым ліку прымяненне ведаў, спецыяльных, агульнавучэбных і інтэлектуальных уменняў з дапамогай выкладчыка. Праявы настойлівасці і імкненне пераадольваць цяжкасці. Авалоданне праграмным матэрыялам, у тым ліку рознай ступені цяжкасці, праявы добрасумленнасці, адказнасці, самаацэнкі і г. д. Свабоднае валоданне праграмным матэрыялам рознай ступені цяжкасці ў незнаёмай сітуацыі, выкананне заданняў творчага характару. Высокі ўзровень самастойнасці і эрудыцыі.

# ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ

| **Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне** | **Назва кафедры** | **Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне** | **Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумару пратакола)** |
|---|---|---|---|
| Гісторыя | Гісторыі Беларусі і славянскіх народаў | Змен няма | Рэкамендавана да зацвярджэння вучэбная праграма ў прадстаўленым варыянце (пратакол № 13 ад 30.04.2021) |
| Гісторыя Расіі і Украіны (XVII ст. – сярэдзіна XIX ст.) | Гісторыі Беларусі і славянскіх народаў | Змен няма | Рэкамендавана да зацвярджэння вучэбная праграма ў прадстаўленым варыянце (пратакол № 13 ад 30.04.2021) |